# Індэкс беларуска-украінскіх адносін

Справаздача
па даследаванні

2025

# Індэкс беларуска-украінскіх адносін

Справаздача
па даследаванні

2025

FREE BELARUS CENTER

FRIEDRICH NAUMANN FOUNDATION For Freedom.
Ukraine

# Уступ

Беларусь і Украіна працягваюць праходзіць праз складаныя працэсы дэканалізацыі. Абедзьве рэспублікі, поспехі якіх у справе геапалітычнага разыходджання з Расіяй адрозніваюцца, надалей захоўваюць дыпламатычныя адносіны. Аднак менавіта яны сёння не вызначаюць характар двухбаковых кантактаў.

Беларускія і ўкраінскія даследчыкі ў межах праекта, які рэалізоўвае Free Belarus Center пры падтрымцы Прадстаўніцтва “Фонду Фрыдрыха Наўмана за Свабоду” ва Украіне, падрыхтавалі ўжо другі Індэкс беларуска-ўкраінскіх адносін, прызначаны для вымярэння «тэмпературы» не толькі афіцыйных кантактаў, але і ўзаемадзеяння ўкраінскіх уладаў з прадстаўнікамі беларускіх дэмакратычных сіл. Гэтыя паралельныя вектары ў абодвух выпадках пакуль не выглядаюць выразна акрэсленымі лініямі, аднак даюць падставу спадзявацца на змены да лепшага.

Якасць адносін ацэньвалася ў сферах палітыкі, эканомікі, бяспекі, культуры і грамадства. Агульны вынік можна сфармуляваць проста: на афіцыйным узроўні двухбаковыя адносіны знаходзяцца каля кропкі замярзання, аднак узаемная цікавасць беларусаў і ўкраінцаў адзін да аднаго захоўваецца. Пасля пачатку шырокамаштабнай агрэсіі Расіі імперскі ўплыў на двухбаковыя адносіны беларусаў і ўкраінцаў істотна зменшыўся, і гэта дасць вынік у найбліжэйшы час.

Залог развіцця беларуска-ўкраінскіх адносін — тактыка малых спраў, рэалізаваных у інтарэсах нашых грамадстваў. Менавіта пра іх неабходна распавядаць па абодва бакі беларуска-ўкраінскай мяжы, бо яны даюць надзею на імпульс у развіцці двухбаковых кантактаў.

# Метадалогія

Аб’ектам вымярэння Індэкса беларуска-ўкраінскіх адносін з’яўляецца стан міжкраінавых адносін паміж Украінай і Беларуссю. Індэкс ацэньвае актуальны стан адносін у трохкутніку «Кіеў – Менск – беларускія дэмакратычныя сілы», а таксама дынаміку іх пазітыўных або негатыўных зменаў.

У другім выданні Індэксу мы не ўтрымаліся ад спакусы пайсці на метадычныя ўдасканаленні. Галоўным чынам гэта тычыцца спосабу разліку значэнняў на падставе экспертных ацэнак: у новай эдыцыі Індэкса разлічваюцца медыянныя значэнні замест сярэдніх, як па асобных параметрах, так і для падліку агульнага значэння Індэксу. Таксама быў нязначна зменены спіс падпараметраў кожнага тэматынага блоку. Гэта дапамагло зрабіць Індэкс больш карэктным са статыстычнага і змястоўнага пункту гледжання, але пазбавіла нас магчымасці наўпроставага параўнацння з Індэксам мінулага году. Каб кампенсаваць такі недахоп былі ўведзены асобныя пытанні адносна кожнага суб-параметра для экспертнай ацэнкі дынамікі зменаў у параўнанні з мінулым годам. Па кожнай групе адносінаў у анкетным апытанні рэспандэнты пазначалі ці змяніліся адносіны за год ў горшы альбо лепшы бок, ці засталіся нязменнымі.

Уся сукупнасць узаемных адносін паміж дзвюма краінамі падзелена на 5 асноўных тэматычных напрамкаў: палітычныя адносіны, эканамічныя адносіны, адносіны ў сферы бяспекі, адносіны ў галіне культуры і адукацыі, адносіны паміж грамадствамі. Кожны з тэматычных напрамкаў адносін складаецца з 5 параметраў, якія падлягаюць экспертнай ацэнцы:

**1. Палітычныя адносіны:**

- Адносіны паміж кіраўнікамі дзяржаў, урадамі і парламентамі
- Адносіны паміж афіцыйнымі дзяржаўнымі інстытутамі Украіны і дэмакратычнымі сіламі Беларусі
- Характар афіцыйных дыпламатычных адносін
- Бягучы стан дагаворна-прававой базы паміж дзяржавамі
- Існаванне механізмаў сінхранізацыі і запазычанняў норм заканадаўства

**2. Эканамічная адносіны:**

- Стан узаемнага гандлю паміж краінамі (характарыстыка экспарту, імпарту, гандлёвага балансу)
- Стан узаемных інвестыцый. Наяўнасць сумесных інвестыцыйных праектаў на ўзроўні дзяржавы або прыватнага бізнесу
- Наяўнасць агульных інфраструктурных праектаў у галіне транспарту, сувязі, энергетыкі, экалогіі, развіцця трансгранічнага супрацоўніцтва, уключаючы шматбаковыя праекты
- Магчымасць вядзення бізнесу грамадзянамі Украіны ў Беларусі і наадварот
- Стан дагаворна-прававой базы ў галіне эканамічных адносін (пагадненні аб свабодным гандлі, прадухіленні двайнога падаткаабкладання, пенсійным забеспячэнні і г.д.)

**3. Адносіны ў сферы бяспекі:**

- Адносіны паміж абароннымі і сілавымі міністэрствамі і ведамствамі Украіны і Беларусі (Міністэрства абароны, Генеральная пракуратура, Міністэрства ўнутраных спраў, службы ўнутранай бяспекі, службы знешняй разведкі)
- Наяўнасць ваеннай канфрантацыі альбо Правядзенне сумесных ваенных вучэнняў, наяўнасць практыкі двухбаковых інспекцый ваеннай актыўнасці Украіны і Рэспублікі Беларусь адпаведна

- Рэалізацыя сумесных праектаў у абаронна-прамысловым комплексе

- Тэндэнцыі развіцця дагаворнай базы і практыкі адносін у галіне бяспекі (барацьбы з міжнароднай злачыннасцю, нелегальнай міграцыяй, экстрадыцыі злачынцаў з Беларусі ва Украіну і наадварот, нераспаўсюджванне ядзернай зброі, ваенна-стратэгічнага супрацоўніцтва, агульных канцэпцый бяспекі, узгадненне палажэнняў заканадаўства абедзвюх краін у адносінах да ваенных злачынстваў, памежнага ці прыпамежнага супрацоўніцтва)

- Кантакты паміж абароннымі і сілавымі міністэрствамі і ведамствамі Украіны і структурамі беларускіх дэмакратычных сіл (беларускіх добраахвотнікаў ва Украіне, Bypol/Belpol, кіберпартызанамі і іншымі)

**4. Адносіны ў галіне культуры і адукацыі:**

- Агульная прадстаўленасьць беларускай культуры ва Украіне і наадварот. Наяўнасць культурных абменаў, гастрольная дзейнасць, узаемадзеянне культурных дзяржаўных і грамадскіх арганізацый

- Актыўнасць у сферы перакладаў літаратуры на беларускую/украінскую мовы

- Вывучэнне гісторыі, культуры і палітыкі Беларусі, а таксама беларускай мовы ва ўкраінскіх універсітэтах, і адпаведнай гісторыі, культуры і палітыкі Украіны, а таксама ўкраінскай мовы ў беларускіх універсітэтах

- Узаемнае прызнанне дыпломаў аб адукацыі ўсіх узроўняў

- Адукацыя беларускіх студэнтаў ва Украіне і наадварот

**5. Адносіны паміж грамадствамі:**

- Стан міжасабовых кантактаў. Наяўнасць візавага рэжыму, наземных і авіязносін, трансгранічныя перамяшчэнні насельніцтва

- Адносіны ўкраінскага і беларускага народаў у люстэрку сацыялогіі

- Характарыстыка ўзаемадзеяння ў інфармацыйнай сферы (практыка пакупкі тэлепраграм, тэлевізійнае вяшчанне беларускіх і ўкраінскіх каналаў на тэрыторыі сумежнай дзяржавы, функцыянаванне старонак інфармацыйных агенцтваў БЕЛТА і «Укрінформ» на ўкраінскай і беларускай мовах адпаведна, украінская аўдыторыя беларускіх каналаў вяшчання і наадварот)

- Наяўнасць «мовы нянавісці» ў медыя Беларусі і Украіны

- Узгодненая палітыка нацыянальнай і гістарычнай памяці

У тых групах адносін, дзе гэта ўяўляецца магчымым, Індэкс таксама надае асобную ўвагу ацэнцы адносін не толькі паміж афіцыйнымі Кіевам і Менскам, але і паміж Кіевам і беларускімі дэмакратычнымі сіламі.

Ацэнка стану адносін ажыццяўляецца на аснове камбінавання метадаў экспертнага анкетнага апытання, серыі паўструктураваных інтэрв'ю, а таксама збору фактычнай і статыстычнай інфармацыі аб стане адносін.

Экспертнае анкетнае апытанне праводзіцца сярод трох груп рэспандэнтаў:

- Прадстаўнікоў экспертнай і акадэмічнай супольнасці (група «эксперты»);

- Прадстаўнікоў палітычных структур, афіцыйных дзяржаўных структур, тэматычных арганізацый грамадзянскай супольнасці. Сюды могуць уваходзіць дзеючыя або былыя палітыкі і чыноўнікі, грамадскія дзеячы (група «палітыкі і грамадзянская супольнасць»);

- Прадстаўнікоў медыя-супольнасці, рэдактараў ці журналістаў (група «медыя»).

Кожная група рэспандэнтаў уключае рэспандэнтаў і з Беларусі, і з Украіны, усяго ў запаўненні анкетнага апытання прынялі ўдзел 22 рэспандэнты.

У анкеце рэспандэнтам-экспертам прапануецца адказаць на 30 тэматычных пытанняў

аб супрацоўніцтве, якія закранаюць як міждзяржаўны ўзровень, так і пытанні практычнай цікавасці для грамадзян абедзвюх краін. Рэспандэнты анкетнага апытання ацэньваюць узровень адносін па кожным з параметраў па шкале ад 1 (самы нізкі ўзровень адносін) да 5 (самы высокі ўзровень адносін).

Для ацэнкі дынамікі развіцця адносін рэспандэнты анкетнага апытання таксама ацэньваюць наколькі змяніўся стан адносін па кожным з параметраў (палепшылася, пагоршылася, засталося нязменным).

Для вызначэння колькаснага значэння Індэкса выводзіцца медыянае значэнне па ўсіх ацэнках (значэнне Індэкса), а таксама медыянае значэнне па кожнай з 5 тэматычных груп (значэнне па групе адносін). Пры разліку Індэкса, для выключэння крайніх ацэнак, прымяняецца winsorization: усе значэнні ніжэй 5-га пэрцэнтыля замяняюцца на значэнне 5-га перцэнтыля, усё значэння вышэй 95-га перцэнтыля на значэнне 95-го перцэнтыля.

У дадатак да анкетнага апытання для атрымання паглыбленых характарыстык стану адносін праводзяцца паўструктураваныя экспертныя інтэрв'ю. Паўструктураваныя інтэрв'ю праводзяцца з дасведчанымі ўкраінскімі і беларускімі экспертамі або практычнымі дзеячамі, занятымі ў адной з тэматычных груп адносін. У дадзенай эдыцыі Індэкса было праведзена 10 паўструктураваных інтэрв'ю.

# 1. Палітычныя адносіны

Значэнне Індэксу: 1

Дынаміка з 2024 году: Адносіны засталіся на тым жа ўзроўні

**1.1 Афіцыйныя палітычныя адносіны.**

Значэнне Індэкса: 1.
Дынаміка: нязначнае пагаршэнне

Стан афіцыйных палітычных адносін паміж Кіевам і Менскам большасць экспертаў - як украінскіх, так і беларускіх — ацэньваюць як вельмі нізкі або практычна неіснуючы. Пасля пачатку поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Украіну ў лютым 2022 года, у якім Беларусь прадаставіла сваю тэрыторыю для нападу, двухбаковыя сувязі аказаліся амаль цалкам замарожаныя.

Палітычны дыялог з цяперашнім менскім рэжымам з'яўляецца немагчымым. У афіцыйнай рыторыцы ўкраінскі бок разглядае Беларусь як суагрэсара і саюзніка Расіі, хоць на заканадаўчым урозні адпаведныя дакументы ніколі не былі прыняты. Як адзначалі былыя ўкраінскія дыпламаты з ліку рэспандэнтаў, палітычныя адносіны «практычна не існуюць» — паміж краінамі не вядзецца ні парламенцкага, ні ўрадавага дыялогу, ні кантактаў на ўзроўні лідэраў краін.

Беларускія эксперты пры гэтым падкрэсліваюць, што на ўзроўні агульнага ўспрымання Беларусі ва Украіне пачаўся асцярожны падзел паміж рэжымам Лукашэнкі і беларускім грамадствам, што адчыняе «вакно магчымасцяў» для будучага ўзаемадзеяння — найперш з дэмакратычна настроенымі беларусамі.

Фармальна дыпламатычныя адносіны не разарваныя. Амбасада Украіны працягвае працаваць, але ва ўрэзаным фармаце. Украінскія дыпламаты застаюцца у Менску ў складзе 3-5 чалавек, выконваючы абмежаваныя функцыі, у асноўным па абароне правоў і інтарэсаў грамадзян Украіны. У той жа час узровень дыпламатычнага прадстаўніцтва зніжаны і прадаўжае зніжацца: пасол адкліканы з 2023 года, функцыі часовага паверанага выконваў саветнік-пасланнік, але з 2025 года адбылося паніжэнне ўзроўню бягучага дыпламатычнага прадстаўніцтва (часова паверанага) да статусу саветніка.

Амбасада Беларусі ў Кіеве, наадварот, законсерваваная і не функцыянуе. Будынак пасольства і прылеглая тэрыторыя прыходзіць у занядпад, што сімвалічна адлюстроўвае агульны ўзровень дэградацыі двухбаковых адносін.

Важна адзначыць, што Украіна свядома ўтрымлівае гэты фармат не толькі для консульскіх паслуг, але, у прыватнасці, для задач, звязаных з абменам ваеннапалоннымі і вяртаннем дэпартаваных дзяцей. Такім чынам, дыпламатычныя адносіны сёння — гэта хутчэй інструмент мінімальна неабходнага практычнага ўзаемадзеяння для Украіны, а не забеспячэнне палітычнага дыялогу паміж краінамі.

Некаторыя эксперты адзначаюць, што нават у гэтых умовах Беларусь захоўвае пэўнае значэнне як «проксі-канал» для ўскосных перамоваў з Расіяй, што было прадэманстравана кантактамі спецпасланніка прэзідэнта ЗША па кантактах з Украінай з Аляксандрам Лукашэнкам у 2025 годзе. Гэта таксама можа выкарыстоўвацца і самой Укрінанай, аднак агулам палітычны і сімвалічны ўзровень гэтых адносін «на самым нізкім узроўні» і без перспектыў паляпшэння ў бліжэйшы час.

**1.2 Узаемадзеянне Украіны з дэмакратычнымі сіламі Беларусі.**

Значэнне Індэкса: 2.
Дынаміка: нязначнае паляпшэнне

Гэтая частка адносін характарызуецца як больш жывая, але абмежаваная і непаслядоўная.

Большасць экспертаў адзначаюць, што Украіна за апошнія два гады пачала наладжваць інстытуцыйныя і публічныя кантакты з дэмакратычнымі сіламі Беларусі. Стварэнне пасады спецпрадстаўніка па Беларусі пры

МЗС Украіны ў 2024 годзе і прызначэнне на яе былога амбасадара ў Беларусі Ігра Кізіма стала важным крокам у легалізацыі стасункаў з апазіцыйнымі структурамі. З'явіліся рэгулярныя кантакты на ўзроўні Вярхоўнай Рады, асобных міністэрстваў, пашырыліся кантакты на ўзроўні экспертаў. У той жа час пасля сыходу Ігара Кізіма з гэтай пасады ў лютым 2025 года, на яе не быў прызначаны новы прадстаўнік. Таксама, наколькі вядома, стратэгія Украіны ў дачыненні да Беларусі, распрацаваная ў межах мандата спецпрадстаўніка па Беларусі у 2024 годзе, не была прынята на афіцыйным узроўні.

Няглездячы на некаторы прагрэс адносіны з дэмакратычнымі сіламі Беларусі застаюцца няроўнымі і нефармальнымі. Украінскія эксперты звяртаюць увагу, што дэмакратычныя сілы Беларусі «віртуальны суб'ект міжнародных адносін» і не маюць паўнавартаснай легітымнасці для афіцыйнага дыялогу. Таму МЗС, паводле дыпламатычных канонаў, не можа ўзаемадзейнічаць з імі нароўні з дзяржаўнымі структурамі. І беларускія, і ўкраінскія эксперты падкрэсліваюць, што ўзровень і характар адносін абумоўлены тым, што дэмакратычныя сілы Беларусі не так шмат могуць даць Украіне ў бягучых умовах вайны, але наяўнасць такога саюзніка сама меней ніяк не шкодзіць Украіне.

На практыцы Украіна адрознівае афіцыйны Менск і дэмакратычныя сілы, лічыць апошнія часткай беларускага грамадства і сваім натуральным партнёрам у доўгатэрміновай перспектыве. Украінскія эксперты падкрэсліваюць, што ўзаемадзеянне будуецца вакол некалькіх тэм:

- падтрымка беларускіх добраахвотнікаў, якія ваююць у складзе узброеных сілаў Украіны (УСУ);
- удзел прадстаўнікоў дэмакратычных сіл у міжнародных форумах сумесна з украінскімі палітыкамі;
- праца з беларускімі грамадзянамі, якія пражываюць ва Украіне;
- абмен інфармацыяй па пытаннях унутранай сітуацыі ў Беларусі.

Офіс Прэзідэнта Украіны, паводле ацэнак некаторых беларускіх экспертаў, застаецца найбольш стрыманым у гэтых кантактах, што стварае ўражанне нявызначанасці і «непрыняцця стратэгічных рашэнняў па беларускім напрамку». Афіцыйны Кіеў пазбягае адкрытых сустрэч на вышэйшым узроўні — візіт Святланы Ціханоўскай ва Украіну, да прыкладу, так і не адбыўся з-за адсутнасці палітычнага рашэння, часткова з-за асцярог раздражнення афіцыйна Менска і яго большых варожых дзеянняў у дачыненні да Украіны.

Некаторыя эксперты падкрэсліваюць пытанне адсутнасці адзінага цэнтру прыняцця рашэнняў па беларускіх пытаннях: *«ва Украіне беларускімі дэмакратычнымі сіламі займаюцца ўсе і ніхто. Вельмі дрэнна, што пайшоў на пенсію Ігарь Кізім, які быў хаця б адзінай ключавой фігурай. Усё вярнулася ў сітуацыю, калі кожнае ведамства, структура, інстытуцыя лічыць магчымым займацца беларускай палітыкай, але атрымліваецца, хто ў лес, хто па дровы... Таму што розныя інстытуцыі маюць розныя ўяўленні (...) і гэтыя ўяўленні часцяком носяць рознанакіраваны характар, слаба стыкуюцца паміж сабой».*

Ва ўзаемадзеянні Украіны з дэмакратычнымі сіламі Беларусі ёсць як пазітыўныя, так і праблемныя моманты. Сярод пазітыўнай дынамікі апошняга года можна адзначыць:

- большую ступень публічнага прызнання як партнёраў і інстытуцыяналізацыю адносін з дэмакратычнымі сіламі, хоць і пры перавазе нефармальных кантактаў. Гэта дало імпульс да росту кантактаў і «бачнасці» беларускага пытання ва ўкраінскай знешняй палітыцы;
- сумесныя публічныя выступленні і ўдзел у палітычных форумах. Удзел афіцыйных украінскіх прадстаўнікоў у мерапрыемствах са Святланай Ціханоўскай і Паўлам Латушкам (напрыклад, на форумах Касцюшкі ў Польшчы і на саміце Еўрапейскай палітычнай супольнасці ў Капенгагене) стаў сімвалічным жэстам салідарнасці;
- найбольш пазітыўна ўспрымаецца дзейнасць беларускіх добраахвотніцкіх аб'яднанняў у ВСУ;

- лозунг «Жыве Беларусь!» з вуснаў прэзідэнта Зяленскага ў навагоднім віншаванні 2025 года быў важным маркерам маральнай падтрымкі дэмакратычнай Беларусі.

Да праблемных момантаў узаемадзеяння з дэмакратычнымі сіламі, на думку экспертаў, можна аднесці:

- адсутнасць у Украіны сістэмнай стратэгіі па Беларусі. Украіна не мае выразнай палітыкі ў адносінах да Беларусі - ні да рэжыму Лукашэнкі, ні да дэмакратычных сілаў. Усе рашэнні сітуатыўныя і прымаюцца «ў ручным рэжыме»;

- нізкі ўзровень каардынацыі паміж рознымі афіцыйнымі структурамі Украіны. Рашэнні залежаць ад палітычнай волі асобных чыноўнікаў, дэпутатаў, кіраўнікоў асобных міністэрстваў, дарадцаў прэзідэнта Украіны, а не ад выбудаванай стратэгіі і структуры яе рэалізацыі;

- недастатковая суб’ектнасць беларускіх дэмакратычных сіл. Іх успрымаюць як абмежаваны па ўплыве, фрагментаваны і канкуруючы паміж сабой сектар. Унутраныя канфлікты і кардынальная розніца пазіцый унутры беларускай апазіцыі зніжаюць давер да яе як да партнёра;

- абмежаваныя рэсурсы і іншыя прыярытэты. Украіна знаходзіцца ў стане вайны і не можа надаваць беларускаму пытанню прыярытэтную ўвагу ці значныя рэсурсы. Падтрымка дэмакратычных сіл ацэньваецца з гледзішча карысці для ўкраінскай бяспекі.

### 1.3 Перспектывы і фактары, якія ўплываюць на дынаміку адносін

Перспектывы аднаўлення палітычнага дыялогу паміж афіцыйным Кіевам і Менскам застаюцца малаверагоднымі ў агляднай будучыні. Большасць экспертаў лічаць, што пры цяперашнім рэжыме Лукашэнкі Украіна не пойдзе на нармалізацыю. Нават калі не адбудзецца фармальнага разрыву дыпламатычных адносін, узровень узаемадзеяння застанецца мінімальным і абмяжуецца консульскай працай.

Магчымыя змены могуць адбыцца ў выпадку сур’ёзных геапалітычных зрухаў — паслаблення Расіі, унутранага крызісу ў Беларусі або змены ўлады. Аднак пакуль Беларусь разглядаецца Кіевам, як залежны ад Крамля суб’ект «без самастойнай знешняй палітыкі».

Перспектывы адносін з дэмакратычнымі сіламі выглядаюць больш пазітыўнымі, хаця і абмежаванай бягучымі рэаліямі. Калі Украіна даб’ецца поспеху на фронце, гэта можа стварыць пазітыўны імпульс для актывізацыі беларускіх дэмакратычных сілаў, росту іх легітымнасці і паглыблення супрацоўніцтва. Пры зацяжной вайне і адсутнасці ўнутраных переменаў у Беларусі можна чакаць стагнацыі — зніжэння перспектыў палітычнай актыўнасці ў Беларусі, страты матывацыі для палітычнай барацьбы, пашырэння інтэграцыі беларускіх эмігрантаў у заходнія грамадства, памяншэння падтрымкі дэмакратычных зменаў унутры беларускага грамадства і, адпаведна, меншай цікавасці Украіны ва ўзаемадзеянні з беларускімі дэмакратамі.

Сярод фактараў, якія ўплываюць на перспектывы, эксперты вылучаюць:

- галоўным чынам, вынік заканчэння расійска-ўкраінскай вайны. Перамога Украіны створыць новую прастору для рэгіянальнай палітыкі і, магчыма, для перафарматавання адносін з Беларуссю;

- важную ролю грае ўнутрыпалітычная сітуацыя ў Беларусі: любое паслабленне рэжыму або яго абмежаваны дрэйф у бок ад Расіі могуць стаць штуршком для кантактаў з Кіевам;

- роля знешніх актараў (ЗША, ЕС). Магчымыя крокі Захаду па частковай «рэабілітацыі» Лукашэнкі дзеля перамоваў з Масквой ствараюць рызыкі «актуалізацыі» беларускага рэжыму і зніжэння значэння дэмакратычных сіл;

- стан і адзінства беларускай апазіцыі. Яе здольнасць выступаць кансалідавана ўплывае на тое, наколькі Украіна будзе ўспрымаць іх як рэальнага партнёра;

- грамадскае меркаванне ва Украіне. Умацаванне вобразу беларусаў як саюзнікаў і паплечнікаў па барацьбе супраць агрэсара павышае шанцы на доўгатэрміновую салідарнасць.

# 2. Эканамічныя адносіны

Значэнне Індэксу: 1

Дынаміка з 2024 году: нязначнае пагаршэнне

**2.1 Агульны характар эканамічных сувязей і дынаміка гандлю**

Да 2022 года Беларусь і Украіна падтрымлівалі значныя аб’ёмы гандлю. Тавараварот даходзіў да некалькіх мільярдаў долараў, а структура ўзаемных паставак уключала шырокую намеклатуру тавараў: нафтапрадукты, хімію, сельскагаспадарчую тэхніку, прадукты харчавання, будаўнічыя матэрыялы. Пасля пачатку поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Украіну ў лютым 2022 года эканамічныя адносіны паміж Беларуссю і Украінай аказаліся практычна паралізаванымі. Узаемны гандаль захаваўся толькі ў нязначных аб’ёмах, пераважна па інэрцыі старых кантрактаў або праз пасрэднікаў у трэціх краінах. Абсалютная большасць экспертаў — як украінскіх, так і беларускіх — сыходзяцца ў меркаванні, што афіцыйны тавараварот паміж краінамі фактычна абнуліўся. Як адзначыў адзін з украінскіх экспертаў, «гандаль вымяраецца тысячамі даляраў, а не мільёнамі ці мільярдамі». У статыстычным выразе гэта азначае сімвалічныя аб’ёмы, якія не аказваюць ніякага ўплыву на эканамічныя працэсы.

Беларусь з украінскага пункту гледжання ўспрымаецца як суагрэсар, што робіць любыя эканамічныя кантакты з ёй таксічнымі для бізнесу і грамадскай думкі ва Украіне. Эксперты з беларускага боку таксама пацвярджаюць, што афіцыйныя пастаўкі спыніліся, а любыя гандлёвыя абмены адбываюцца «ў шэрай зоне». Паводле ацэнкі беларускага эканаміста, сітуацыя характарызуецца як «нуль па афіцыйных лічбах і амаль нуль па неафіцыйных». Пры гэтым застаюцца рэдкія выключэнні, звязаныя пераважна з нафтапрадуктамі, шклом і сельскагаспадарчай тэхнікай, якія пастаўляюцца па нефармальных каналах праз трэція краіны, часцей за ўсё праз Польшчу або краіны Балтыі.

**2.2 Сектары захаванага або «шэрага» ўзаемадзеяння**

Нягледзячы на агульны абвал гандлю, некаторыя сектары захоўваюць кропкавае ўзаемадзеянне. Першым чынам, гаворка ідзе пра IT-індустрыю. Беларускія аўтсорсінгавыя кампаніі, такія як EPAM, працягваюць мець офісы і супрацоўнікаў ва Украіне. Частка IT-спецыялістаў, якія пакінулі Беларусь пасля 2020 года, працуюць дыстанцыйна, захоўваючы сувязі з украінскім рынкам. Такім чынам, лічбавая эканоміка застаецца рэдкім прыкладам супрацоўніцтва, якое працягваецца, пераважна дзякуючы транснацыянальнаму характару галіны.

Некаторыя беларускія эксперты згадваюць таксама гандаль оптыкай і кампанентамі падвойнага прызначэння, якія прыватныя беларускія вытворцы маглі перанесці за мяжу, у прыватнасці ў Еўропу ці Украіну. Такія пастаўкі маюць індывідуальны, фрагментарны характар і ажыццяўляюцца прыватным бізнесам, а не дзяржаўнымі прадпрыемствамі.

Акрамя таго, існуе абмежаванае ўзаемадзеянне ў сектары нафтапрадуктаў і шкла. Беларускія нафтапрадукты часам трапляюць на ўкраінскі рынак праз Польшчу ці Балканы. Аднак эксперты падкрэсліваюць, што аб’ёмы мінімальныя і заснаваныя на абыходных схемах. «Шэрыя лініі» гандлю носяць устойлівы, але паўлегальны характар. Украіна фармальна забараняе імпарт з Беларусі, але некаторыя ланцужкі паставак маскіруюцца пад здзелкі з трэцімі краінамі. Беларускія тавары, асабліва нафтапрадукты, пастаўляюцца ў гэтыя краіны, дзе страчваюць след паходжання, пасля чаго могуць быць перапрададзены ўкраінскім кампаніям пад выглядам еўрапейскіх. Аналагічна, украінская прадукцыя можа трапляць на беларускі рынак праз пасярэднікаў у ЕС ці іншых краінах. Гэтыя схемы не фармуюць сістэмнай эканомікі, а толькі задавальняюць кропкавыя патрэбы бізнэсу ў абыход санкцый. Пры гэтым абодва бакі ўсведамляюць, што такія механізмы вядуць да страты падатковых паступленняў і росту карупцыйных рызык.

## 2.3 Інвестыцыйныя і інфраструктурныя сувязі

Усе апытаныя эксперты адзіныя ў меркаванні, што новых інвестыцыйных ці інфраструктурных праектаў паміж краінамі няма. Некаторыя праекты, пачатыя да 2022 года, маглі захавацца ў замарожаным выглядзе, але пра якую-небудзь новую інвестыцыйную дзейнасць размова не ідзе. Беларускія інвестыцыі ва Украіну, якія існавалі перш за ўсё ў гандлі і будаўніцтве, былі або згорнутыя, або пераафармленыя пад іншыя юрысдыкцыі, каб не фігураваць як прамое ўзаемадзеянне з Менскам.

Частка беларускіх прадпрымальнікаў працягвае дзейнасць ва Украіне, аднак гэта, як правіла, даваенныя бізнэсы, легалізаваныя да пачатку канфлікту. Яны не з'яўляюцца новымі інвестыцыямі, а ўяўляюць сабой рэшткавыя формы прысутнасці, часта ў сферы IT, лагістыцы і медыях. Як прыклад згадваецца беларускі спартовы партал «Трыбуна Бай», які развіў украінскі сегмент пасля 2022 года.

Украінскі капітал, наадварот, практычна адсутнічае ў Беларусі. Па словах экспертаў, украінскія кампаніі ўспрымаюць беларускі рынак як палітычна таксічны і эканамічна рызыкоўны. Пасля ўвядзення санкцый і абмежавання банкаўскіх аперацый магчымасці для ўкраінскіх інвестараў цалкам зніклі.

## 2.4 Магчымасці вядзення бізнесу грамадзянамі дзвюх краін

Практычна ўсе эксперты адзначаюць, што вядзенне бізнесу грамадзянамі вельмі абцяжарана, аднак асобныя прыклады ўсё ж існуюць. У Беларусі ўкраінскія грамадзяне могуць займацца прадпрымальніцтвам толькі пры ўмове лаяльнасці да беларускай улады і адсутнасці сувязі з украінскай дзяржавай. Такія прадпрымальнікі разглядаюцца як «нейтральныя» і не ўяўляюць пагрозы. У той жа час грамадзяне Беларусі, якія знаходзяцца ва Украіне, сутыкаюцца з сістэмнымі праблемамі легалізацыі: закрытыя банкаўскія рахункі, частыя праверкі Службы бяспекі, немагчымасць атрымання грамадзянства ці доўгатэрміновых дазволаў на працу.

Некаторыя ўкраінскія эксперты падкрэслівалі страчаныя магчымасці Кіева ў дачыненні да беларускіх эмігрантаў. Беларусы, якія пакінулі краіну пасля 2020 года і ваявалі на баку Украіны, маглі б стаць каштоўным рэсурсам для аднаўлення эканомікі, асабліва ў будаўніцтве і тэхнічных галінах. Аднак бюракратычныя бар'еры і падазронасць з боку спецслужбаў перашкаджаюць іх легалізацыі, развіццю іх прадпрымальніцкай актыўнасці, паўнавартаснаму выхаду на рынак працы.

Такім чынам, магчымасці вядзення бізнесу украінцамі ў Беларусі і беларусамі ва Украіне існуюць дэ-юрэ, але дэ-факта абмежаваныя палітычнай кан'юнктурай, рызыкамі пераследу і недаверам паміж краінамі.

# 3. Адносіны ў сферы бяспекі

Значэнне Індэксу: 1

Дынаміка з 2024 году: нязначнае пагаршэнне

### 3.1 Агульны характар адносін у сферы бяспекі і ацэнка ваеннай напружанасці

Сучасныя адносіны паміж Беларуссю і Украінай у сферы бяспекі характарызуюцца спалучэннем адкрытай канфрантацыі і вымушанага прагматызму, дзе абодва бакі захоўваюць мінімальныя каналы камунікацыі, імкнучыся пазбегнуць прамога ваеннага сутыкнення. Большасць экспертаў сыходзяцца ў ацэнцы таго, што Беларусь, выступаючы саюзнікам і фактычным суагрэсарам Расіі, страціла давер з боку Украіны, а ранейшыя фарматы супрацоўніцтва ў галіне бяспекі поўнасцю згорнутыя.

Разам з тым украінскі бок, які ўсведамляе значэнне паўночнага напрамку і патэнцыяльную пагрозу з боку Беларусі, прытрымліваецца ўзважанай стратэгіі стрымлівання без эскалацыі. Па словах экспертаў, канфрантацыя паміж краінамі мае «нізкаінтэнсіўны» характар — няма актыўных баявых дзеянняў, але захоўваецца высокі ўзровень насцярожанасці і ваеннай прысутнасці на мяжы.

Абодва бакі ўзмацнілі памежную інфраструктуру: з украінскага боку ўмацаваны пераходы і разгорнутыя дадатковыя падраздзяленні, Беларусь стварае новыя памежныя заставы і праводзіць дэманстратыўныя ваенныя вучэнні, што разглядаецца Украінай і ЕС як інструмент ціску.

Ключавой крыніцай напружання застаецца выкарыстанне тэрыторыі Беларусі расійскімі войскамі. Украінскія эксперты адзначаюць, што менавіта гэта, а не само беларускае войска, успрымаецца як асноўная пагроза бяспецы. Прысутнасць расійскіх кантынгентаў стварае рызыкі новых нападаў з паўночнага кірунку, а рэгулярныя вучэнні («Захад-2025» і інш.) успрымаюцца як магчымая падрыхтоўка да агрэсіўных дзеянняў

У той жа час, нават на фоне канфрантацыі, захоўваюцца негалосныя дамоўленасці аб «ненападзенні», якія забяспечваюцца праз абмежаваныя каналы сувязі, асабліва ў крызісныя перыяды.

Беларусь, са свайго боку, знаходзіцца ва ўразлівым становішчы. З аднаго боку яна ўцягнутая ў саюзніцкія абавязкі перад Расеяй, з іншага — імкнецца пазбегнуць прамога ўдзелу ў вайне. У экспертных ацэнках гучыць матыў «асцярожнага дыстанцыявання»: Менск дэманструе лаяльнасць Маскве, але імкнецца не перасекчы рысу, якая прывяла б да адкрытага сутыкнення з Украінай. Гэтая дваістасць спараджае складаную камбінацыю канфрантацыі без вайны, дзе асноўнае супрацьстаянне разгортваецца ў сферы інфармацыйнай і разведвальнай актыўнасці.

### 3.2 Кантакты паміж сілавымі структурамі і спецслужбамі

Нягледзячы на афіцыйнае спыненне двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы абароны, неафіцыйныя і тэхнічныя каналы ўзаемадзеяння паміж сілавымі структурамі захоўваюцца. Большасць экспертаў зазначаюць, што ўзаемадзеянне адбываецца паміж памежнымі службамі, якія працягваюць абменьвацца базавай інфармацыяй для забеспячэння парадку на 1084,2 кіламетрах мяжы.

Гэтыя кантакты мінімальныя і носяць пераважна тэхнічны характар: абмен апавяшчэннямі аб перасячэнні мяжы, інцыдэнтах з беспілотнікамі, каардынацыя пры абмене палоннымі.

Акрамя таго, існуе нефармальнае ўзаемадзеянне паміж спецслужбамі дзвюх краін. Па словах аднаго з рэспандэнтаў, яно абапіраецца на старыя прафесійныя сувязі, якія захаваліся яшчэ з часоў сумеснага навучання ў савецкіх вайсковых вучэльнях і разведшколах. Гэтыя сувязі дазваляюць аператыўна вырашаць асобныя пытанні, хаця афіцыйна яны нідзе не прызнаюцца. Гаворка ідзе аб своеа-

саблівай «ценявой дыпламатыі бяспекі», якая выконвае функцыю прадухілення выпадковых інцыдэнтаў або недастатковага разумення, здольных прывесці да эскалацыі.

З украінскага боку такія камунікацыі разглядаюцца як неабходны элемент ваеннай дыпламатыі, які забяспечвае двухбаковыя запэўненні ў ненападзе. Кантакты адбываюцца па лініі Генеральных штабоў, разведвальных органаў і Міністэрстваў абароны, спецслужбаў бяспекі, і накіраваны на падтрыманне стабільнасці ўздоўж мяжы і прадухіленне некантраляваных дзеянняў. Як зазначае адзін з экспертаў, менавіта пасля атрымання Украінай гарантый з боку Беларусі, што нападу з яе тэрыторыі больш не будзе, украінскія войскі змаглі часткова перанакіраваць сілы на іншыя ўчасткі фронту (Курская аперацыя), што пацвярджае практычную значнасць гэтых каналаў.

Існуе прадуктыўная каардынацыя ў гуманітарных пытаннях, у прыватнасці, для абмену ваеннапалоннымі і эвакуацыі грамадзянскіх асоб. Беларусь прадаўжае выступаць як пляцоўка для абмену палоннымі, што патрабуе пэўнага ўзроўню ўзаемадзеяння паміж ваеннымі і дыпламатычнымі структурамі абедзвюх краін. Як адзначаэ адзін з рэспандэнтаў: «Гуманітарныя аперацыі па абмене ваеннапалоннымі, целамі забітых, уз'яднанні сем'яў адбываюцца на тэрыторыі Беларусі і атрымліваюць высокую ацэнку ўкраінскага боку з пункту гледжання іх арганізацыі Менскам».

Пры гэтым няма падстаў гаварыць аб аднаўленні якога-небудзь фармальнага супрацоўніцтва ў сферы бяспекі. Украіна разглядае Беларусь найперш праз прызму пагрозы, а не партнёрства. Афіцыйныя інстытуты ўзаемадзейнічаюць пастолькі, паколькі гэта неабходна для прадухілення крызісаў і рашэння пэўных прагматычных пытанняў, але не больш за тое.

### 3.3 Адносіны з беларускім добраахвотніцкім рухам і праблемы ўзаемадзеяння

Адной са складаных, але сімвалічна значных сфераў беларуска-ўкраінскіх адносін з'яўляецца ўзаемадзеянне Украіны з беларускімі добраахвотнікамі, якія ўдзельнічаюць у вайне. Практычна ўсе эксперты адзначаюць, што гэтыя адносіны носяць праблемны характар: з аднаго боку, беларускія байцы разглядаюцца як саюзнікі і паплечнікі ў барацьбе за свабоду Украіны, з іншага — як грамадзяне дзяржавы, прызнанай суагрэсарам, што стварае для іх юрыдычныя і палітычныя складанасці.

Беларускія добраахвотнікі служаць у складзе розных падраздзяленняў Сіл абароны Украіны — ад Палка імя Кастуся Каліноўскага да асобных атрадаў у складзе Інтэрнацыянальнага легіёна і разведвальных структур. Фармальна яны інтэграваныя ва ўкраінскую армію, падпарадкоўваюцца ўкраінскаму камандаванню і ўдзельнічаюць у баявых дзеяннях нароўні з украінскімі вайскоўцамі, аднак пры гэтым захоўваюць сваю этнічную і палітычную ідэнтычнасць, і некаторую долю публічнай аўтаноміі. На думку асобных экспертаў, гэта надае іх прысутнасці асаблівае значэнне: у выпадку эскалацыі з рэжымам Лукашэнкі Украіна можа прадставіць гэтыя падраздзяленні як інструмент «вызвалення Беларусі ад расійскага ўплыву», а не як акт агрэсіі супраць суседняй дзяржавы.

Асноўныя праблемы, якія адчуваюць беларускія добраахвотнікі, маюць прававы і арганізацыйны характар. Сярод іх — адсутнасць выразнага статусу, цяжкасці легалізацыі і знаходжання ва Украіне, абмежаваныя магчымасці кар'ернага росту ў арміі, праблемы з атрыманнем выплат і прызнаннем удзелу ў баявых дзеяннях. У апошнія гады, аднак, назіраюцца некаторыя пазітыўныя змены: у Вярхоўнай Радзе абмяркоўваецца норма аб скарачэнні тэрміну службы, неабходнага для атрымання ўкраінскага грамадзянства з трох гадоў да аднаго года; распрацоўваецца заканадаўства аб множным грамадзянстве, што дазволіць добраахвотнікам легалізавацца без адмовы ад беларускага пашпарта.

Палітычны складнік таксама застаецца адчувальным. Украінскія ўлады абмяжоўваюць удзел дзейных беларускіх вайскоўцаў у палітычных ініцыятывах, такіх як выбары ў Каардынацыйную раду беларускіх дэмакратычных сілаў. Гэта тлумачыцца неабходнасцю захавання ваеннай дысцыпліны і нейтралітэту, але ўспрымаецца добраахвотнікамі як абмежаванне іх суб'ектнасці і палітычнай ролі.

Беларускія эксперты дадаюць, што многія добраахвотнікі сутыкаюцца з бытавой недаверлівасцю і падазрэннямі з боку ўкраінскіх

спецслужбаў, а таксама з праблемамі легалізацыі пасля завяршэння службы. Гэта ўзмацняе пачуццё няўпэўненасці адносна сваёй будучыні і перспектыў удзелу ў пасляваенным аднаўленні Украіны ці дэмакратычнай трансфармацыі Беларусі. Некаторыя рэспандэнты характарызуюць стаўленне ўкраінскіх структур як «прагматычна спажывецкае» — добраахвотнікаў цэняць на фронце, але ім не прапануюць доўгатэрміновага бачання або палітычнага месца ў будучых працэсах.

Тым не менш, добраахвотніцкі рух застаецца важным элементам сімвалічнага і практычнага партнёрства паміж Украінай і беларускай дэмакратычнай супольнасцю. Яно дэманструе, што частка беларускага грамадства свядома выбрала бок свабоды і супраціўлення расійскай агрэсіі, што адрознівае яе ад афіцыйнай лініі Менска і стварае патэнцыял для будучага перазапуску двухбаковых адносін ужо ў постлукашэнкаўскі перыяд.

# 4. Адносіны ў сферы культуры і адукацыі

Значэнне Індэксу: 2

Дынаміка з 2024 году: нязначнае паляпшэнне

### 4.1 Агульны стан культурных і адукацыйных сувязей

Пагаршэнне стану афіцыйных культурных і адукацыйных сувязей пачалося ўжо пасля 2020 года, а з пачаткам поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Украіну афіцыйныя сувязі паміж Беларуссю і Украінай у гэтых галінах фактычна спынілі існаванне. Усе эксперты зазначаюць, што на дзяржаўным узроўні супрацоўніцтва адсутнічае, а любыя сумесныя праграмы паміж універсітэтамі ці міністэрствамі адукацыі больш не рэалізуюцца. Украінскія эксперты наўпрост параўноўваюць сітуацыю з адносінамі паміж Кіевам і Масквой: *«абмен студэнтамі з Менскам сёння выглядае гэтак жа нерэалістычна, як з Масквой».*

Тым не менш, асабістыя і гарызантальныя кантакты паміж прадстаўнікамі культуры, навукі і адукацыі цалкам не зніклі. На індывідуальным узроўні яны захоўваюцца — у асяроддзі беларускай дыяспары, праз акадэмічныя колы ў Еўропе і Украіне, а таксама ў рамках супрацоўніцтва незалежных культурных і адукацыйных ініцыятыў. Найбольш актыўна ўзаемадзеянне адбываецца з беларусамі, якія пасля палітычных рэпрэсій аказаліся за межамі краіны — у Польшчы, Літве ці Украіне. Менавіта гэтыя суполкі сёння выконваюць ролю альтэрнатыўных пляцовак для дыялогу, замяшчаючы афіцыйныя інстытуты. Прыкладам можа служыць Форум Астрожскіх, дзе раз на год праходзяць беларуска-ўкраінскія экспертныя і палітычныя дыскусіі, ёсць некаторы ўзровень супрацоўніцтва ўкраінскіх ВНУ з Еўрапейскім гуманітарным універсітэтам у Вільні.

Пры гэтым назіраецца адсутнасць сістэмнасці ў культурных узаемаадносінах. Большасць украінскіх экспертаў прызнаюць, што падтрымка беларускай культуры ва Украіне носіць лакальны характар і трымаецца на энтузіязме асобных людзей і малых ініцыятыў. У самой Беларусі сучасная ўкраінская культура — асабліва новая, незалежная, некан'юнктурная — фактычна забаронена або выцесненая.

### 4.2 Прыклады актуальнага ўзаемадзеяння ў галіне культуры

Нягледзячы на палітычную ізаляцыю, паміж украінскімі і беларускімі дзеячамі захоўваецца шэраг актуальных форм супрацоўніцтва ў сферы культуры. Гэта найперш сумесныя культурныя падзеі, пераклады літаратуры і актыўнасць беларускай дыяспары ва Украіне.

Пераклады літаратурных твораў застаюцца адной з нешматлікіх жывых форм узаемадзеяння. Так, у рамках грантавай праграмы House of Europe былі падтрыманы два праекты перакладу беларускіх аўтараў на ўкраінскую мову — паэтычны зборнік Алеся Плоткі «Сож» і раман Альгерда Бахарэвіча «Дзеці Аліндаркі». Аднак, як адзначае адзін з удзельнікаў праекту, гэтыя кнігі выдаюць невялікія маргінальныя выдавецтвы, і яны наўрад ці атрымаюць шырокае распаўсюджванне ва Украіне.

У зваротным кірунку — пераклады ўкраінскіх аўтараў на беларускую мову — таксама адбываюцца, хоць і пераважна за межамі Беларусі. Напрыклад, у Варшаве беларускія выдаўцы перакладалі кнігі Сяргея Жадана.

Усе эксперты падкрэсліваюць, што менавіта незалежныя культурныя і грамадзянскія

ініцыятывы ўтрымліваюць беларуска-украінскія адносіны ад поўнага замарожвання. Яны з'яўляюцца адзіным жывым каналам камунікацыі, які дзейнічае незалежна ад афіцыйных рэжымаў. Напрыклад, у Львове праводзяцца курсы беларускай мовы, арганізуюцца выставы, тэатральныя пастаноўкі і мемарыяльныя акцыі, напрыклад, «Ноч (не) расстраляных паэтаў». Такія праекты не толькі захоўваюць беларускую ідэнтычнасць у эміграцыі, але і садзейнічаюць развіццю ўзаемаразумення паміж грамадствамі дзвюх краін.

Сярод лічбавых форм узаемадзеяння можна вылучыць медыяпраекты і праекты ў сацыяльных сетках, дзе працягваецца культурны дыялог. Беларускі YouTube-праект «Трызуб і Пагоня» расказвае пра агульныя старонкі беларуска-ўкраінскай гісторыі і мае дзясяткі тысяч праглядаў. Такім чынам, нават ва ўмовах палітычнай ізаляцыі захоўваецца ўзаемная цікавасць і сімпатыя паміж аўдыторыямі дзвюх краін.

У той жа час, эксперты адзначаюць ўнутраную стомленасць і фрагментацыю беларускай супольнасці ва Украіне. Пасля 2022 года актыўнасць некаторых арганізацый знізілася — часткова з-за эмацыйнага выгарання, часткова з-за асцярог адкрыта заяўляць аб сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці. Многія беларусы, якія пражываюць ва Украіне, стараюцца інтэгравацца, не падкрэсліваючы нацыянальную прыналежнасць, што зніжае бачнасць беларусаў і беларускай культуры ва ўкраінскай прасторы.

Эксперты ўказваюць на праблемныя аспекты ў стратэгічных падыходах некаторых беларускіх культурных актараў. Адзін з украінскіх экспертаў у галіне культуры звяртае ўвагу на «крыўду на крыўду»: украінскае грамадства ўспрымае беларусаў праз прызму ўдзелу Беларусі ў вайне, а беларускія незалежныя дзеячы не заўсёды праяўляюць гатоўнасць да разумення глыбіні гэтай праблемы. Як прыклад прыводзіцца сітуацыя з фестывалем «Прадмова» ў 2024 годзе, у праграму якога ўключылі расійскіх апазіцыйных аўтараў. Гэта выклікала неразуменне і пратэст украінскіх удзельнікаў і паказала, наколькі тэма «добрых рускіх» стала таксічнай у кантэксце двухбаковых культурных адносін беларусаў і украінцаў.

### 4.3 Праблемы і складанасці ўзаемадзеяння

Галоўнай праблемай у сферы культурных і адукацыйных адносін з'яўляецца адсутнасць інстытуцыйнай асновы супрацоўніцтва. З 2022 года не існуе ні міжурадавых пагадненняў, ні праграм абмену, ні сумесных універсітэцкіх праектаў. Беларусістыка ў Кіеўскім універсітэце Шаўчэнка, па словах аднаго з экспертаў, пазбавілася якой-небудзь падтрымкі з боку афіцыйных структур і засталася без інстытуцыйнага развіцця.

Другая праблема — моўная і ідэнтыфікацыйная нявызначанасць. Некаторыя беларускія дзеячы культуры працягваюць супрацоўнічаць з расійскімі апазіцыйнымі коламі і выкарыстоўваць рускую мову як асноўную, што ўспрымаецца ва Украіне вельмі насцярожана. Такая пазіцыя, на думку некаторых украінскіх экспертаў, падрывае давер і перашкаджае наладжванню паўнацэннага партнёрства.

Нарэшце нельга не адзначыць уплыў вайны і пытанняў бяспекі. Ва ўкраінскіх універсітэтах і медыях тэма Беларусі часта табуюецца ці ўспрымаецца праз прызму саюзніцкіх адносін Менска з Масквой. Гэта прыводзіць да знікнення беларускай тэматыкі з акадэмічнага і культурнага дыскурсу.

# 5. Адносіны паміж грамадсвамі

Значэнне Індэксу: 2

Дынаміка з 2024 году: нязначнае пагаршэнне

**5.1 Фарміраванне вобраза іншай краіны: інфармацыйныя палі, прапаганда і мова варожасці**

Адносіны паміж беларускім і ўкраінскім грамадствамі сёння шмат у чым вызначаюцца станам інфармацыйных прастораў дзвюх краін. Практычна ўсе эксперты адзначаюць асіметрычнасць і дваістасць гэтых палёў: у Беларусі яно падзелена на афіцыйнае — кантраляванае дзяржавай, і незалежнае — эмігранцкае або апазіцыйнае. Ва Украіне інфармацыйнае поле змешчанае да асвятлення дзейнасці дзяржавы і палітыкі рэжыму Беларусі, а не беларускага дэмакратычнага руха.

Беларускія дзяржаўныя медыі праводзяць «шчыльную антыўкраінскую прапаганду», фармуючы вобраз ворага праз дэзінфармацыю, гістарычныя скажэнні і абвінавачванні ўкраінцаў у «генацыдзе беларускага народа» ў часы Другой сусветнай вайны. Гэта падаецца ва ўнісон з расійскай прапагандай, няхай і ў змякчанай форме. Паралельна незалежныя медыі, як у самой Беларусі, так і на эміграцыі, выбудоўваюць альтэрнатыўны дыскурс, дзе салідарызуюцца з Украінай і прадстаўляюць яе як краіну, што змагаецца за свабоду і дэмакратыю. Такім чынам, інфармацыйнае поле Беларусі палярызавана, а ўспрыманне Украіны залежыць ад крыніцы, якую спажывае чалавек.

Украінскае медыяасяроддзе, у сваю чаргу, у цэлым не праяўляе сістэмнай мовы нянавісці, аднак, па словах шэрагу экспертаў ва ўкраінскай інфармацыйнай прасторы Беларусь часта рэдукуецца да фігуры Лукашэнкі. Навіны аб краіне — гэта, перш за ўсё, цытаты і дзеянні Лукашэнкі, а не матэрыялы аб грамадзянскай супольнасці, культуры або дэмакратычных сілах. Беларускі народ нярэдка аказваецца «закладнікам» негатыўнага вобразу дзяржавы.

Эксперты таксама адзначаюць, што з часам эмацыйны градус успрымання Беларусі ва Украіне зніжаецца. У першыя месяцы вайны 2022 года ўкраінскія СМІ актыўна транслявалі шок і крыўду, паколькі напад на Украіну ішоў праз тэрыторыю Беларусі. Але па меры развіцця вайны гэтая тэма «прытупілася» і, ў адсутнасці атак з тэрыторыі Беларусі, яна перастае разглядацца як актыўны агрэсар, а беларусы — як непасрэдныя ворагі. Цяпер украінскае грамадскае ўспрыманне стала крыху больш нейтральным, хоць і насцярожаным.

**5.2 Кантакты паміж людзьмі і прыпамежныя ўзаемадзеянні**

Амаль усе рэспандэнты сыходзяцца ў тым, што чалавечыя кантакты знаходзяцца на мінімальным узроўні. Фактычна мяжа паміж Беларуссю і Украінай закрытая, функцыянуе толькі адзін прапускны пункт, а паездкі магчымыя толькі ў выключных выпадках. Беларускія і ўкраінскія эксперты таксама падкрэсліваюць, што шматлікія праверкі, допыты і працяглыя працэдуры перасячэння ўкраінскай мяжы (пры ўездзе з ЕС, напрыклад) робяць паездкі яшчэ больш складанымі. Беларускія памежнікі таксама праяўляюць павышаную падазронасць да ўкраінцаў, што падмацрўвае атмасферу недаверу і кантролю. Фактычна рух мінімальны — «кантакты існуюць, але яны нязначныя».

З іншага боку, захоўваюцца асабістыя сувязі: сваякі, сябры, былыя калегі. Гэтыя кантакты падтрымліваюцца, але часта ў «ценявым», схаваным рэжыме, што натуральна для сітуацыі бяспекі людзей унутры Беларусі, дзе любая публічная праява салідарнасці з Украінай можа прывесці да допытаў у КДБ і арышту.

Некаторыя ўкраінцы перасякаюць мяжу ў пошуках прытулку ці каб пазбегнуць мабіліза-

цыі, што ўжо выкарыстоўваецца прапагандай Лукашэнкі. Гэтыя выпадкі могуць быць інтэрпрэтаваныя афіцыйнымі беларускімі медыямі як доказ «гуманнасці» рэжыму і «нежадання ўкраінцаў ваяваць».

Тым не менш, нават у такіх умовах эксперты бачаць патэнцыял для гуманітарных і культурных мастоў. Культурная і адукацыйная сфера застаецца найбольш перспектыўнай для аднаўлення дыялогу, паколькі яна дазваляе захоўваць кантакты па-за рамкамі афіцыйных палітычных адносін.

### 5.3 Узаемнае ўспрыманне грамадстваў: паміж спагадай і насцярожанасцю

Узаемнае ўспрыманне беларусаў і ўкраінцаў вызначаецца спалучэннем эмпатыі, палітычнай ацэнкі і медыйных стэрэатыпаў.

Унутры Беларусі стаўленне да ўкраінцаў амбівалентнае. Сярод прыхільнікаў рэжыму пераважаюць прапагандысцкія клішэ пра «ўкраінскі нацыяналізм» і «варожыя сілы», але большасць насельніцтва захоўвае нейтральна-пазітыўнае стаўленне. Эксперты адзначаюць, што беларусы спачуваюць украінцам і пазбягаюць варожасці. Аднак публічнае выказванне падтрымкі можа быць небяспечным, таму салідарнасць існуе «ў цішыні».

Ва Украіне вобраз Беларусі больш складаны. З аднаго боку, беларусы асацыююцца з аўтарытарным рэжымам і саюзам з Расіяй, што выклікае скепсіс і расчараванне. З іншага боку, значную павагу выклікаюць беларускія добраахвотнікі, якія ўдзельнічаюць у абароне Украіны, і, у меншай ступені, дэмакратычныя актывісты. Таму ўспрыманне залежыць ад пазіцыі канкрэтнага чалавека: беларусы, якія выказваюць салідарнасць і антыімперскую пазіцыю, успрымаюцца цёпла, тады як «апалітычных» часта прыраўноўваюць да «добрых рускіх».

Сацыялагічныя назіранні пацвярджаюць, што негатыўнае стаўленне да Беларусі ўзмацнілася пасля 2022 года, асабліва ў памежных рэгіёнах, дзе фіксаваліся абстрэлы з беларускай тэрыторыі. Але нават там яно не параўнальнае з антырасейскімі настроямі. Украінцы адрозніваюць «рэжым Лукашэнкі» і «народ Беларусі», хаця ў масавым успрыманні гэтая мяжа нярэдка размытая.

Цікава, што моўнае і культурнае самавызначэнне мае ролю маркера ўспрымання. Як адзначаюць асобныя беларускія эксперты, беларус, які размаўляе па-беларуску і адкрыта дэманструе сваю нацыянальную ідэнтычнасць, успрымаецца ва Украіне значна лепш, чым той, хто выкарыстоўвае рускую мову і не выражае нацыянальнай адметнасці.

### 5.4 Гістарычная памяць: поле для дыялогу ці крыніца палярызацыі

Гістарычная памяць выступае важным, але пакуль недавыкарыстаным рэсурсам для дыялогу паміж грамадствамі. У адказах экспертаў прысутнічаюць два напрамкі: ініцыятывы, накіраваныя на прымірэнне і сумеснае асэнсаванне мінулага, і дзяржаўныя наратывы, якія, наадварот, узмацняюць падзел.

Да ліку пазітыўных практык эксперты адносяць беларуска-ўкраінскі Форум Астрожскіх, які аб’ядноўвае навукоўцаў, гісторыкаў, палітолагаў і грамадска-палітычных дзеячаў. Форум, акрамя іншага, стаў пляцоўкай для абмеркавання гістарычных траўм, узаемных вобразаў і пошукаў агульных пунктаў памяці. Цяпер разглядаецца ідэя стварэння Беларуська-ўкраінскай грамадскай камісіі гісторыкаў — недзяржаўнага аналага двухбаковых камісій, якія ўжо існуюць у Украіны з Польшчай, Аўстрыяй і Германіяй.

У той жа час, афіцыйная Беларусь працягвае выкарыстоўваць гістарычную рыторыку як інструмент прапаганды. Менск, як адзначаюць некаторыя рэспандэнты, падкрэслівае «вінаватасць украінцаў» у ваенных злачынствах супраць беларусаў, а савецкі і постсавецкі сімвалізм (напрыклад, святкаванне 9 траўня) выкарыстоўваецца для падтрымання ідэалагічнага падзелу. Украінскі бок, у сваю чаргу, гераізуе нацыянальна-вызваленчыя рухі, што ў беларускім дзяржаўным наратыве інтэрпрэтуецца як «нацызм».

Асобныя ўкраінскія ініцыятывы, напрыклад, увекавечанне Канатопскай бітвы, інтэрпрэтуюцца ўкраінскімі даследчыкамі як магчымасць падкрэсліць гістарычнае саюзніцтва Украіны і Беларусі супраць Расіі. Аднак такія наратывы пакуль застаюцца перыферыйнымі і не набылі шырокага грамадскага значэння.

# 6. Агульнае значэнне Індэксу






## Значэнне індэкса, параметры, 2025




## Афіцыйныя палітычныя адносіны і адносіны з дэмакратычнымі сіламі Беларусі



# Высновы

**Палітычныя адносіны**

- Палітычныя адносіны паміж Беларуссю і Украінай знаходзяцца ў стане глыбокай крызы, дзе афіцыйная дыпламатыя зведзена да тэхнічнага мінімуму, а ўзаемадзеянне з дэмакратычнымі сіламі паступова набывае больш важнае значэнне, але ўсё яшчэ характарызуецца няўстойлівасцю і стратэгічнай нявызначаннасцю.

- Беларусь застаецца для Украіны краінай адкуль прыйшла агрэсія, але ў той жа час патэнцыйным партнёрам у будучыні — пасля палітычных пераменаў.

- Адносіны паміж Кіевам і афіцыйным Менскам — замарожаныя, паміж Кіевам і дэмакратычнай Беларуссю —- зачаткавыя, але жыццяздольныя.

- Далейшая дынаміка адносінаў з беларускім дэмакратычным рухам будзе вызначацца не толькі воляй бакоў, але і ходам вайны, станам рэжыму Лукашэнкі, дзеяннямі знешніх міжнародных актараў (ЕС і ЗША), а таксама гатоўнасцю беларускага дэмакратычнага руху захаваць суб'ектнасць і адзінства ва ўмовах працяглага крызісу.

**Эканамічныя адносіны**

- Эканамічныя адносіны паміж Беларуссю і Украінай практычна поўнасцю разбураныя: нармальныя механізмы двухбаковага гандлю і інвестыцый зведзены да ледзь прыкметных аб'ёмаў. На рынку працягваюць дзейнічаць лакальныя, нефармальныя і шэрыя схемы эканамічных абменаў, але і яны не істотныя.

- На макраўзроўні эканымічныя сувязі разарваныя, але на мікраўзроўні захоўваюцца асобныя ніткі - IT-сектар, асабістыя прадпрымальніцкія ініцыятывы, гандаль праз пасрэднікаў і трэція краіны.

- Беларуская экономіка застаецца зацікаўленай у аднаўленні экспартных напрамкаў, уключна з украінскім рынкам, аднак без змены палітычнага кантэксту і санкцыйнага рэжыму гэта немагчыма. Для Украіны, у сваю чаргу, Беларусь перастала быць надзейным эканамічным партнёрам і ўспрымаецца як элемент варожага блоку.

- Эканамічнае ўзаемадзеянне дзвюх краін знаходзіцца ў стане замарожанага канфлікту, дзе фармальныя адносіны адсутнічаюць, а нефармальныя — функцыянуюць на мяжы легальнасці. Гэтае становішча, па ўсёй верагоднасці, захаваецца да таго часу, пакуль не адбудуцца істотныя змены ў сферы бяспекі і палітыкі.

**Адносіны ў сферы бяспекі**

- Беларуска-ўкраінскія адносіны ў сферы бяспекі на ўзроўні дзяржаваў сёння ўяўляюць сабой шматузроўневую сістэму стрымак, недаверу і абмежаванага прагматызму. З аднаго боку — поўнае разбурэнне ранейшых фарматаў супрацоўніцтва, з іншага — захаванне мінімальных камунікацый, прадыктаваных неабходнасцю прадухілення выпадковай эскалацыі. Кантакты паміж сілавымі структурамі і спецслужбамі застаюцца неафіцыйнымі, але жыццёванеабходнымі, бо забяспечваюць узаемныя гарантыі ненападзення і дазваляюць рэагаваць на інцыдэнты.

- Беларускія добраахвотнікі, якія ваююць за Украіну, сталі своеасаблівым маральна-палітычным мастом паміж грамадствамі Украіны і Беларусі, Украінай і беларускім дэмакратычным рухам. У той жа час становішча беларускіх добраахвотнікаў ва Украіне сутыкаецца са шматлікімі праблемамі, уключаючы праблемы легалізацыі, выплаты дапамогі, паўнавартаснай інтэграцыі ў жыццё Украіны пасля фронту.

**Культура і адукацыя**

- Сучасны стан беларуска-ўкраінскіх адносін у сферы культуры і адукацыі можна ахарактарызаваць як глыбокі крызіс афіцыйнага ўзаемадзеяння пры захаванні кропкавай актыўнасці на ўзроўні грамадзянскай супольнасці. Дзяржаўная дыпламатыя і інстытуцыйныя сувязі разбураны, аднак культурныя і гуманітарныя зносіны працягваюцца дзякуючы намаганням незалежных актараў з двух бакоў — перакладчыкаў, актывістаў, асобных групаў акадэмічнай супольнасці і выкладчыкаў, экспертаў, прадстаўнікоў беларускай дыяспары, асобных арганізацый грамадзянскай супольнасці.

- Нягледзячы на цяжкасці, некаторая цікавасць да беларускай культуры ва Украіне захоўваецца. Для незалежнай прадэмакратычнай часткі беларускага грамадства ўзаемадзеянне з Украінай застаецца важным элементам культурнага і палітычнага самавызначэння.

- Для таго, каб адносіны ў сферы культуры і адукацыі зноў набылі сістэмны характар, неабходна пераадолець эмацыйныя і палітычныя бар’еры, узмацніць каардынацыю паміж незалежнымі структурамі і распрацаваць доўгатэрміновыя механізмы культурнага абмену, незалежныя ад палітычных рэжымаў і кан’юнктурных фактараў.

**Адносіны паміж грамадствамі**

- Адносіны паміж беларускім і ўкраінскім грамадствамі сучаснага перыяду можна ахарактарызаваць як замарожаныя, але патэнцыйна аднаўляльныя. Інфармацыйныя палі застаюцца палярызаванымі, але ў абедзвюх краінах існуе пласт грамадзян і інстытуцый, зацікаўленых у захаванні сувязяў і развіцці паразумення.

- На ўзроўні паўсядзённых адносін захоўваюцца давер, спачуванне і памяць аб блізкасці народаў, аднак вопыт вайны і ўдараў з боку Беларусі ва Украіне, страх, рэпрэсіі і прапагандысцкія бар’еры ў Беларусі перашкаджаюць адкрытаму дыялогу.

- Рэгулярныя культурныя кантакты і кантакты на ўзроні арганізацый грамадзянскай супольнасці абмежаваныя, але выступаюць сёння адным з асноўных каналаў «народнай дыпламатыі».

- Ключавым выклікам на бліжэйшыя гады стане аднаўленне даверу — праз сумесныя праекты ў розных сферах: у культуры, у палітыцы памяці і гісторыі, у незалежных медыя-праектах і г.д. Важным фактарам з’яўляецца ўсведамленне Украінай адрознення паміж беларускім рэжымам і народам Беларусі, а таксама замацаванне гэтага адрознення ў практыцы больш інстытуцыяналізаваных адносін.

- Патэнцыял фармавання новай мадэлі беларуска-ўкраінскіх адносін найперш ляжыць не ў палітычных дэкларацыях і сустрэчах, а ва ўзаемнай павазе да народаў, культурнай эмпатыі, сумеснай гістарычнай памяці і актуальнай практыцы агульнай барацьбы за свабоду ўкраінскага і беларускага народаў.

# Эксперты



**Андрэй Ягораў**

Грамадскі дзеяч, беларускі метадолаг і палітолаг. З 1999 года прайшоў шлях ад шэраговага валанцёра арганізацый грамадзянскай супольнасці да лідэра буйных грамадскіх арганізацый і ініцыятыў. З'яўляецца старшынёй рады міжнароднага НДА «ЕўраБеларусь». У 2013-2015 гадах з'яўляўся нацыянальным каардынатарам Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства (ФГС УП) па Беларусі, а ў 2014-2015 гадах — сустаршынёй Кіраўнічага камітэта Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства. Каардынатар па міжнароднай дапамозе ў Офісе Святланы Ціханоўскай (2022-2023). Спікер Каардынацыйнай рады Беларусі другога складу (2023-2024). Удзельнік мінскай метадалагічнай супольнасці, калега беларускага філосафа Уладзіміра Мацкевіча.



**Роза Турарбекава**

Доктар гістарычных навук. Скончыла гістарычны факультэт Казахскага нацыянальнага ўніверсітэта (КазНУ) імя Аль-Фарабі (1987-1992), аспірантуру па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» (1992-1995), абараніла доктарскую дысертацыю па тэме «Знешняя палітыка Прэзідэнта Расіі (тэарэтычныя і практычныя аспекты)» (1997), выкладчыца кафедры міжнародных адносін КазНУ (1993-1996), намесніца дэкана факультэта міжнародных адносін універсітэта «Кайнар» (Алматы) (1997-1998). Дацэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1999-2022), актывістка Вольнага прафсаюза ў БДУ, запрошаная навуковая супрацоўніца Універсытэта Юстуса-Лібіха (Гісэн, Нямеччына) і стыпэндыятка DAAD (верасень 2022 – красавік 2023), ганаровая сябра IGSD (Універсітэт Уорыка, Вялікабрытанія). Навуковыя інтарэсы: еўразійскія рэгіянальныя арганізацыі і інтэграцыйныя праекты, знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь, ісламізм і палітычныя працэсы ў Цэнтральнай Азіі. Сёння навуковы інтарэс даследчыцы сканцэнтраваны на вывучэнні так званай "Саюзнай дзяржавы" Беларусі і Расіі.



**Яўген Магда**

Кандыдат палітычных навук, дацэнт. У 1996 годзе з адзнакай скончыў гістарычны факультэт Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі, у 2006 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Рэгіянальны канфлікт на Блізкім Усходзе ў глабальным кантэксце». Прафесар Дзяржаўнага ўніверсітэта «Кіеўскі авіяцыйны інстытут». Аўтар даследаванняў «Гібрыдная вайна: выжыць і перамагчы» (Харкаў, 2015), «Гібрыдная агрэсія Расіі: урокі для Еўропы» (Кіеў, 2017). Разам з Таццянай Вадатурскай напісаў кнігу «Гульні адлюстраванняў: як свет бачыць Украіну» (Харкаў, 2016). У 2017 годзе ў выдавецтве «Клуб сямейнага адпачынку» выйшла кніга «Шосты. Успаміны пра будучыню» — даследаванне пра ўкраінскіх прэзідэнтаў. З студзеня 2018 года — дырэктар ГА «Інстытут сусветнай палітыкі». Эксперт iSANS.

# Змест


**Уступ....4**

**Метадалогія....5**

**1.Палітычныя адносіны**

Афіцыйныя палітычныя адносіны....8

Узаемадзеянне Украіны з дэмакратычнымі сіламі Беларусі....8

Перспектывы і фактары, якія ўплываюць на дынаміку адносін....10

**2. Эканамічныя адносіны**

Агульны характар эканамічных сувязей і дынаміка гандлю....11

Сектары захаванага або «шэрага» ўзаемадзеяння....11

Інвестыцыйныя і інфраструктурныя сувязі....12

Магчымасці вядзення бізнесу грамадзянамі дзвюх краін....12

**3. Адносіны ў сферы бяспекі**

Агульны характар адносін у сферы бяспекі і ацэнка ваеннай напружанасці....13

Кантакты паміж сілавымі структурамі і спецслужбамі....13

Адносіны з беларускім добраахвотніцкім рухам і праблемы ўзаемадзеяння....14

**4. Адносіны ў сферы культуры і адукацыі**

Агульны стан культурных і адукацыйных сувязей....16

Прыклады актуальнага ўзаемадзеяння ў галіне культуры....16

Праблемы і складанасці ўзаемадзеяння....17

**5. Адносіны паміж грамадсвамі**

Фарміраванне вобраза іншай краіны: інфармацыйныя палі, прапаганда і мова варожасці....18

Кантакты паміж людзьмі і прыпамежныя ўзаемадзеянні....18

Узаемнае ўспрыманне грамадстваў: паміж спагадай і насцярожанасцю....19

Гістарычная памяць: поле для дыялогу ці крыніца палярызацыі....19

**Агульнае значэнне Індэксу-графікі....20**

**Высновы....22**

**Эксперты....24**

FREE BELARUS CENTER

FRIEDRICH NAUMANN FOUNDATION For Freedom.
Ukraine